# АДНОСІНЫ БНР З ГЕРМАНІЯЙ У 1918 Г.

**А. І. Французаў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; г. Мінск;*
*fedrich48@gmail.com;*
*навук. кір. - У. Е Снапкоўскі, д-р гіст. навук, праф.*

Тэма БНР у сучаснай беларускай гістарыяграфіі паступова займае сваё належнае месца, у той час калі ў савецкай гістарыяграфіі яна была забаронена, ці амаль цалкам разглядалася з ненавуковых пазіцый. Савецкія аўтары падыходзілі да даследванняў з ідэалагічнай прадузятасцю, спасылаліся на адны і тыя ж крыніцы, часта падкрэсліваючы толькі асобныя, «патрэбныя» радкі дакументаў. Галоўнай «віной» і нават здрадніцтвам БНР інтарэсам працоўных мас лічылася арыентацыя на Германію. БНР называлі “марыянетачнай дзяржавай”, створанай па нямецкаму праекту. Але сёння высняецца, што сітуацыя складалася наадварот: у нямецкай палітыцы Беларусь займала маргінальнае месца і афіцыйны Берлін не вельмі жадаў мець справы з беларускім нацыянальным рухам. Таму тэма гэтай працы, безумоўна, вартая даследавання і ўяўляе навуковы інтарэс.

***Ключавыя словы:*** БНР; Германія; Першая сусветная вайна; тэлеграма кайзеру; устаўныя граматы; дыпламатыя БНР.

Пасля заключэння Брэсцскага міра беларусы зразумелі, што ім няма адкуль чакаць падтрымкі. Расійская палітыка не лічылася з планамі стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы ў этнаграфічных межах. Германія ў нейкім плане заняла месца Расіі пасля 25 сакавіка ў знешнепалітычных арыенцірах БНР. Пра важнае месца Германіі ў знешняй палітыцы БНР сведчаць успаміны А. Луцкевічаў: «Мы, седзячы in medias res нямецкай палітыкі, ведаем аб кожным кроку нямецкай дыпляматыі. Нам – збоку – лепей відаць якімі дарогамі ідзе нямецкая ўласць. І толькі на грунце злучэння ўсіх беларускіх сіл можна даць ёй тую пэўнасць, якую яна жадае» [7, с. 68-69]. Аднак тады беларускі рух не меў ні міліцыі, ні войска, ні дзяржаўнага апарату, каб утрымаць уладу на сваёй тэрыторыі.

Пасля адыходу бальшавікоў у лютым 1918 г. з тэрыторыі Беларусі большая яе частка, у тым ліку Мінск, апынулася пад нямецкай акупацыяй. Улічваючы фактар палітычнага рэалізму, беларусы шукалі кантактаў з тым, каму належыла рэальная улада на гэтай тэрыторыі. Цікава, што такая сітуацыя пратрымалася нядоўга, бо ўжо ў снежні нямецкія войскі пакінулі Беларусь, а у студзені 1919 г. пачалася савецка-польская вайна, якая акрэсліла новы расклад сіл на беларускай зямлі. Таксама прыклады Літвы і Украіны, незалежнасць якіх была падтрымана Германіяй, падаваліся вельмі прывабнымі для дзеячоў БНР. Па меркаванню Ю. Туронка, Германія мела планы па стварэнні беларускай

дзяржавы, каб запяспечыць існаванне Літвы і УНР, не раздзяляючы іх мяжой з РСФСР [6, с.526].

У лютым-сакавіку адбыліся першыя кантакты дзеячаў БНР як з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, так і з афіцыйны Берлінам. 28 лютага Народным Сакратарыятам быў накіраваны мемарандум да акупацыйнай адміністрацыі, у якой дзеячы БНР цытавалі змест Першай Устаўной Граматы, спрабавалі высветліць стаўленне немцаў да беларускай справы і зацікавць немцаў у супрацоўніцтве. 9 сакавіка Рада БНР накірала той жа змест кацлеру Германіі праз радыётэлеграму. [5, с. 37-40, 43-46]. 17 сакавіка Радай БНР была накіравана тэлеграма непасрэдна рэйхсканцлеру Георгу фон Гертлінгу, у якой змяшчаўся пратэст супраць планаў перадачы беларускіх зямель Польшчы [5, с. 36]. Акрамя таго, ураду БНР было патрэбна ўзгадняць амаль кожнае сваё дзеянне з акупацыйнымі ўладамі, напрыклад публікацыю Устаўных грамат у прэсе, фарміраванне мясцовых рад і г. д. І, трэба адзначыць, акупацыйная адміністрацыя ставілася больш спрыяльна за афіцыйны Берлін да беларускай справы.

Кабінет Я. Варонкі быў змушаны вельмі дэлікатна дзейнічаць у сферы адносін з Германіяй. Так склалася, што грамадская думка і настроі былі скіраваны па большасці ў бок Расіі, што было замацавана на І Усебеларускім з’ездзе, таму з кожным крокам да Германіі Народны Сакратарыят страчваў сімпатыі з боку насельніцтва Беларусі [4, с. 249]. Аднак, нягледзячы на гэта, дзеячы БНР захоўвалі ідэю незалежнай Беларусі і шукалі шляхі яе рэалізацыі. Рада БНР пры абвяшчэнні незалежнасці прызнала Брэсцкі мір нядзейсным. Інфарамацыю пра ўтварэнне Рэспублікі і жаданне перагляду трактата НС БНР прадставіў нямецкаму ўраду. У адказе канцелер Георг фон Гертлінг засведчыў, што згодна з Брэсцкім мірам Берлін ставіцца да Беларусі як да часткі Савецкай Расіі і не можна без згоды ўрада Леніна прызнаць новастворaную Беларускую дзяржаву [4, с. 250].

У красавіку 1918 г. акрэсліўся новы шлях зносін з Германіей: праз нямецкую амбасаду ва Украіне. 25 красавіка адбыўся прыём дэлегацыі БНР паслом Германіі ў Кіеве, на якім дзячы БНР у чарговы раз паспрабавалі зацікавіць нямецкі бок у супрацоўніцтве з беларусамі, але поспеху гэты крок не прынёс [1, с. 125-128]. Таксама ў красавіку адбыліся ўнутрыпалітычная змены ў Радзе БНР, у склад якойы увайшлі сябры Мінскага прадстаўніцтва, асобы заможных станаў, на чале з Р. Скірмунтам. Тэлеграма Рады БНР да кайзера Германіі Вільгельма ІІ ад 26 красавіка 1918 г. з’яўляецца адлюстраваннем такога палітычнага «дрэйфа». У ёй Рада БНР падзяквала імператара за вызваленне Беларусі

ад Расіі і выказала надзею на прызнанне беларускай дзяржавы, якая будзе арыентавана на Германію [7, с. 67].

27 мая у Вільні адбылася аудыенцыя дэлегацыі БНР на чале з Я. Варонкам у галоўнакамандуючага Х нямецкай арміі Э. фон Фалькенгайна. Апошні станоўча характэрызаваў сваё стаўленне да беларускай справы, была дасягнута згода аб супрацоўніцстве германскай улады і беларускіх органаў. Дамовіліся, што як толькі штаб пераедзе ў Мінск, два бакі пачнуць супрацоўніцтва ў сферах «установления мирных взаимоотношений белорусского народа и германских войск,… а это умиротворение страны даст лучшие последствия». Такім чынам, гэта афіцыйная сустрэча, як вядома з пратаколу, адбылася цалкам у пазітыўным тоне і акрысліла пэўны поспех беларускай дыпламатыі [5, с. 79-80].

Пасля перадыслакацыі галоўнага штаба ў Мінск пачалося актыўнае супрацоўніцтва акупацыйнай адміністрацыі і ўрада БНР. Была дасягнута дамоўленнасць аб стварэнні інстытута дарадчыкаў пры павятовых камендантах з мэтай угэгулявання ўзаемаадносін насельніцтва і германскіх войск. Беларускія органы атрымалі права ўдзелу ў вырашэнні сваіх гаспадарчых, культурна-асветніцкіх і прафесіянальных пытанняў. Як адзначаў Я. Варонка, «беларуская справа стала заваёўваць усё болей і болей правоў» [2, с.12]. Так, гэта быў пэўны поспех у мясцовым уладкаванні, які даваў надзею на афіцыйнае прызнанне БНР Германіей. Але ў сухой рэшце на дыпламатычнай ніве становішча наўрад ці палепшылася. 10 ліпеня 1918 г. Народны Сакратарыят прапанаваў Радзе разгледзець пытанне аб пасыле дэлегацыі ў Берлін. Пра паездку дэлегацыі нічога не вядома, таму можна выказаць згадку, што прапанова была адхілена [1, с. 204].

На працягу ліпеня кабінет І. Серады займаўся ў асноўным культурніцкай і гаспадарчай працай на Беларусі: мэтай ставілася пабудова беларускай гімназіі і падрыхтоўка школ да пачатку навучальнага года, адкрыццё ў Мінску беларускага ўніверсітэту, удасканаленне працы гандлёва-эканамічнай палаты пры Народным Сакратарыяце. Станоўчае развіццё падзей працягвалася да таго часу, пакуль 27 жніўня Германія не заключыла з РСФСР Дадатковы дагавор, паводле якога я Германія абавязвалася адвесці свае войскі на захад і не ўмешвацца ў адносіны Расіі з яе абласцямі, г. зн. не будзе спрыяць і падрымліваць стварэнне самастойных дзяржаўных утварэнняў у гэтых раёнах [3, с. 58]. У адказ на гэта Рада БНР 28 жніўня накіравала ноту канцлеру Георгу фон Гертлінгу, у якім назвала дагавор «актом политической хирургии» і пратэставала супраць новага раздраблення

беларускіх зямель і асабліва перадачы заходніх тэрыторый Польшчы [1, с. 243].

18 кастрычніка беларуская дэлегацыя накіравала старшыні рэйхстага і рэйхсканцлеру Германіі ноту аб прызнанні незалежнасці Беларусі. У той жа дзень у Берлін была накіравана дэлегацыя БНР на чале з Р. Скірмунтам з прапановай прызнаць незалежнасць Беларусі, што па меркаванню дэлегацыі, было неабходна як у інтэрэсах Беларусі, так і ў інтэрэсах Германіі [3, 66]. Але дэлегацыя да канцлера дапушчана не была, у той час як 20 кастрычніка канцлер прыняў літоўскую дэлегацыю і пацвердзіў прызнанне незалежнасці Літоўскай дзяржавы[4, с. 293].

У лістападзе у Германіі адбылася рэвалюцыя і было падпісана Кампʼенскае перамірʼе, паводле якога Германія капітулявала, адначасова ануляваўся Брэсцкі мір, што давала прастору для манеўра. У такім становішчы Рада БНР спрабавала ўступіць у перамовы з нямецкай Салдацкай Радай, дзе ставіліся б пытанні перадачы паўнаты ўлады на Беларусі Радзе Народных Міністраў, але поспехам яны не скончыліся [1, с. 292]. Неўзабаве, у канцы лістапада , пачаўся наступ савецкіх войск на Беларусь, якія займалі тэрыторыі, што пакідалі нямецкія войскі.

Германскі вектар у знешняй палітыцы БНР у 1918 г. быў даволі складаны. Беларуская дыпламатыя паспрабавала розныя захады: ад асцярожнай тактыкі кабінета Варонкі да «адкрытага наступу» кабінета Скірмунта і абмежавання на  культурніцкай і гаспадарчай сферах кабінета Серады, але галоўная мэта — афіцыйнае прызнанне беларускай дзяржавы, не была дасягнута. Напэўна, адной з галоўных прычын гэтага было нежаданне Германіі парушаць умовы Брэсцскага міра. Абвяшчэнне незалежнай беларускай дзяржавы ў пэўным сэнсе спазнілася. У сакавіку 1918 г. было ўжо позна пераглядаць дамову, пад якой не было беларускага подпісу. Таксама трэба адзначыць, што беларускі рух быў даволі слабы, слабейшы за польскі і ўкраінскі, гэта, безумоўна, змяншала важнасць беларускіх дзяржаўных патрабаванняў у вачах дзяржаў, якія вяршылі лёс беларускай зямлі.

Але нельга змяншаць гістарычную значнасць падзей 1918 г., таму што 25 сакавіка 1918 г. ўпыршыню адбылася дэкларацыя незалежнасці Беларусі. Вядома, што працэс стварэння дзяржавы праходзіў у складаным міжнародным становішчы. Беларуская дыпламатыя шукала розныя шляхі прызнання, галоўным з якіх была германская падтрымка, але нават калі германскі вектар у 1918 г. не прынес жаданага поспеху, дзеячы БНР не спынілі сваёй працы. У 1919 г. дыпламатыя БНР прабівала шляхі для беларускай дзяржавы на мірнай каферэнцыі у Парыжы, у кабінетах еўрапейскіх кіраўнікоў і праз дыпламатыяная місіі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Архівы Беларускаи Народнаи Рэспублікі.* Фонд No 582 Дзяржаунага архіва Літвы (Рада міністрау БНР) / склад. С. Шупа. – Вільня–Нью Ерк–Менск–Прага, 1998. – Т. 1, Кн. 1, - 850 с.
2. *Варонка, Я.* Беларускі рух ад 1917 да 1920 году / Я. Варонка. - Коўна: Друкарня А. Бака і Х. Манкес, 1920. - 18 с.
3. *Знешняя палітыка Беларусі* : зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; рэдкал. У. М. Міхнюк (гл. рэд) [і інш.]. - Мінск: БелНДІДАС, 1997. / Т. 1 : 1917—1922 гг. - 385 с.
4. *Міхалюк, Д.* Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918-1920 гг. / Д. Міхалюк. - Смаленск : Інбелкульт, 2015. - 495 с.
5. *Сакалоўскі, У.* Надзвычайная місія БНР ў Нямеччыне (1919-1925) / У. Сакалоўскі // Arche Пачатак. - 2009 - №3 - С.7-329.
6. *Туронак. Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. - Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2006. - 877 с.
7. *Шупа, С.* Падарожжа ў БНР/ С. Шупа –Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2018. - 282 с.